# СІСТЭМА БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ Ў ГАЛІНЕ КУЛЬТУРЫ

**А.І. СЦЕПАНЦОЎ,**
*дацэнт кафедры тэорыі і практыкі культуры*
*Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры*

Развіццё чалавецтва ў цэлым як глабальны сацыяльны працэс адбываецца ў трох яго асноўных сферах калектыўнай дзейнасці — духоўнай, палітычнай і матэрыяльнай. Пры гэтым **першаступеннае значэнне для аптымальнага ўтварэння сацыяльнай структуры маюць адукацыйныя ўстановы**. Яны фарміруюць эліту ўсіх сфер арганізацыі грамадства — палітычнай, эканамічнай і культурнай [11, с. 48].

Бясспрэчна, што адукацыя — усеабдымная з'ява чалавечага жыцця, яна пранізвае ўсе напрамкі чалавечай дзейнасці і забяспечвае яе пераемнасць і абнаўленне. Цесна звязаныя адно з адным паняцці **«чалавек»**, **«культура»**, **«адукацыя»**. Культура і адукацыя вызначаюць сутнасць чалавека, характарызуюць грамадства і, у сваю чаргу, ствараюцца чалавекам, грамадствам. Адукацыя фарміруе свядомасць, менталітэт, культурную парадыгму, дазваляе ісці ўглыб да засваення духу культуры, яна скіравана на развіццё творчых сіл чалавека, паступальнага ўзбагачэння творчага патэнцыялу асобы.

У энцыклапедычна-даведачнай літаратуры выдзяляюцца спецыфічныя рысы адукацыі, якія абазначаюць і сферу сацыякультурнай практыкі, і галіновую сістэму, і спецыяльна арганізуемы працэс, і пэўны вынік дзейнасці [5, с. 478]. На нашу даследчую думку, **галоўнай прыкметай адукацыі з'яўляецца яе працэсуальнасць, бесперапыннасць.**

Сама думка аб карыснасці пастаяннага назапашвання ведаў зарадзілася ў аддаленыя часы і ў тым ці іншым выглядзе сустракаецца ў навуковых працах многіх вучоных. Маецца адлюстраванне нават у народнай творчасці: усім вядома руская прыказка «век живи — век учись» (ці па-беларуску: «будзем вучыцца, пакуль смерць налучыцца». — *Рэд.*). Перарастанне ідэі «перманентнага» (г. зн. бесперапыннага) навучання чалавека на працягу ўсяго працоўнага жыцця ў канцэпцыю пачалося ў першай палове мінулага стагоддзя і набыло навуковыя абрысы ў 1970—80-я гг. Метадалагічную распрацоўку канцэпцыі бесперапыннай адукацыі найбольш поўна выклаў Роберт Дэйв (R. Dave) [7, с. 33—79].

### Прынцыпы бесперапыннай адукацыі паводле Р. Дэйва

- працягласць адукацыі праз усё жыццё чалавека;
- цэласнасць агульнаадукацыйнай сістэмы (дашкольнае выхаванне, асноўная, пасляшкольная, паўторная ці паралельная адукацыя); інтэграцыя ўсіх яе ўзроўняў і формаў;
- гнуткасць і разнастайнасць зместу, сродкаў і методык, часу і месца адукацыі;
- дынамічны падыход да ведаў — здольнасць да асіміляцыі новых дасягненняў навукі.

Гэтая канцэпцыя адпавядае і патрэбам грамадскага развіцця, і патрэбам кожнага чалавека, бо ва ўмовах імклівай трансфармацыі сацыяльнага асяроддзя толькі пастаянная падтрымка ўласнай

* Артыкул рэкамендаваў доктар філалагічных навук, прафесар А.Я. Міхневіч.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кваліфікацыі і прафесійнага майстэрства можа дазволіць спецыялісту адчуваць сябе ўпэўнена і, у сваю чаргу, быць цікавым для іншых.

**Канцэпцыя бесперапыннай адукацыі ў поўнай меры адпавядае новаму праблемна-практычнаму метаду навучання з няспынным працэсам развіцця асобы, падрыхтоўкі да універсальнай дзейнасці, які прыйшоў на змену традыцыйнай сістэме адукацыі з апісальным, асветніцкім характарам асноўнага метаду навучання (вербальна-кніжнага) і арыентаванай на выкананне пэўных функцый у дадзеных сацыяльных умовах.**

У сферы культуры сістэма бесперапыннай адукацыі мае пэўную ўстойлівасць і выбудаванасць, што, перш за ўсё, тлумачыцца спецыфікай мастацкай адукацыі, якая патрабуе ранняй прафесіяналізацыі навучання. Сутнасць мастацка-адукацыйнага спосабу ніколі не была абмежавана вербальна-кніжным метадам навучання. **Асновай тут заўсёды было практычнае засваенне мастацтва.**

Галіновыя ўстановы адукацыі займаюць асаблівае месца ў сферы культуры. Яны складаюць сістэму прафесійнай адукацыі і ўвабралі ў сябе важкія сілы, якія здольны ўплываць на развіццё ўсіх відаў мастацтва на Беларусі, забяспечваць установы культуры прафесійнымі кадрамі. Неабходна сказаць, што яны ў многім вызначаюць мастацкія патрэбнасці, інтарэсы і густы людзей, абумоўліваюць узровень мастацкай культуры слухацкай і глядацкай аўдыторыі.

Прафесійная адукацыя ў сферы культуры падзяляецца на **два кірункі па відах прафесійнай мастацкай дзейнасці:** 1) падрыхтоўка спецыялістаў — стваральнікаў і інтэрпрэтатараў мастацкіх каштоўнасцей; 2) падрыхтоўка арганізатараў культурнага працэсу, паслуг у сферы вольнага часу.

З 1.07.2001 г. уведзены Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь «Спецыяльнасці і кваліфікацыі» [6]. Гэты дакумент створаны ўпершыню. Ён уваходзіць у


ОКРБ 011-2001
ОБЩЕГОСУДАРСТВЕННЫЙ КЛАССИФИКАТОР РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Специальности и квалификации

Спецыяльнасці і кваліфікацыі

Издание официальное

Госстандарт
Минск

ОКРБ 011-2001. Общегосударственый классификатор Республики Беларусь

склад Адзінай сістэмы класіфікацыі і кадзіравання тэхніка-эканамічнай і сацыяльнай інфармацыі (АСКК ТЭСІ) Рэспублікі Беларусь. Пры захаванні нацыянальнай спецыфікі ён падрыхтаваны ў адпаведнасці з Міжнароднай стандартызацыяй адукацыі (МСКА-97), а таксама звязаны з пералікам спецыяльнасцей прафесійнай адукацыі Расійскай Федэрацыі. Вышэйшы і сярэдні ўзроўні прафесійнай адукацыі маюць аднолькавую пабудову, агульныя профілі і кірункі адукацыі. У адпаведнасці з Агульнадзяржаўным класіфікатарам, вышэйшая прафесійная адукацыя ў сферы культуры мае **наступныя профілі адукацыі** (з лацінскімі літарнымі абазначэннямі):

A. Педагогіка.

C. Мастацтва.

D. Гуманітарныя навукі.

E. Камунікацыі. Права. Эканоміка. Упраўленне.

M. Сацыяльная абарона.

Кірунак мастацкай прафесійнай дзейнасці «стварэнне і інтэрпрэтацыя мастацкіх каштоўнасцей» утрымліваецца ў наступных профілях адукацыі: C, D. Іх забяспечваюць усе тры ВНУ мастацтваў: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі і Беларуская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаўная акадэмія мастацтваў. Другі кірунак — «арганізацыя культурнага працэсу, паслуг у сферы вольнага часу» — утрымліваецца ў про-філях адукацыі А, Е, М; яны цалкам забяспечваюцца Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры [6, с. 21—42].

**Стрыжнем прафесійнай адукацыі ў сферы культуры з'яўляецца мастацкая адукацыя, якая ў сваёй аснове скіравана на традыцыі класічнага мастацтва і ідэй гуманізму.**

**Мастацкая адукацыя — аснова прафесійнай адукацыі ў галіне культуры.** Гэта пэўны від адукацыі, які ўводзіць у эмацыянальную сферу чалавека бязмежны свет мастацтва ў яго спецыфічных формах. «Мастацтва — тэрмін, які выкарыстоўваецца ў двух значэннях: 1) майстэрства, уменне, спрыт, зручнасць, развітыя веданнем справы; 2) творчая дзейнасць, накіраваная на стварэнне мастацкіх твораў, шырэй — эстэтычна-выразных форм» [5, с. 284]. З гэтага вызначэння вынікае і **сутнасць адукацыі ў мастацтве** — навучыць, выпрацаваць уменне дзейнічаць у пэўным відзе мастацтва лёгка і прыгожа, наблізіць да раскрыцця яго сутнасці, замацаваць і развіць схільнасць да творчай дзейнасці.

Даследчык Л.Е. Раманенка ў артыкуле «Мастацкая адукацыя як феномен культуры: пастаноўка праблемы» разглядае мастацкую адукацыю як сутнасную асаблі-васць чалавечай жыццядзейнасці, абумоўленую неабходнасцю творчага развіцця сучаснага чалавека ва ўзаемасувязі з духоўным яго ўдасканаленнем, імкненнем да разумення сэнсу і гармоніі быцця [10, с. 19]. Яна лічыць, што мастацкая адукацыя не з'яўляецца манаполіяй абраных, а скіравана на ўсё грамадства і мае важную мэту — перабудову і ўдасканаленне грамадства праз развіццё яго культуры.

В.П. Пракапцова ў манаграфіі «Мастацкая адукацыя ў Беларусі» вызначае мастацкую адукацыю як працэсуальную форму перадачы сукупнасці ведаў, навыкаў, метадаў, творчых прынцыпаў, вопыту мастацкага светаўспрымання, што фарміруецца ў выніку творчай дзейнасці мастака, музыканта, дзеяча тэатра ў адзінстве суб'ектыўных і аб'ектыўных момантаў [8, с. 6].

**Мастацкая адукацыя развіваецца ў двух напрамках — агульнаэстэтычным і прафесійным.** Сфармулюем паняцце для апошняга: прафесійная мастацкая адукацыя — тэхналагічна пабудаваная дзейнасць па выпрацоўцы комплексу прафесійных ведаў, навыкаў, уменняў з мэтай стварэння (вытворчасці) мастацкіх каштоўнасцяў, якая адбываецца ў сістэме ўстаноў бесперапыннай адукацыі. У адрозненне ад прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, заснаваных на фармальна-тэхнічным рамястве, дзе галоўнае — знешняе (фармальна-эмпірычнае) перайманне, прафесійна-мастацкія навучальныя ўстановы базіруюцца на спасціжэнні мастацкага вымыслу, на разумовым стварэнні («абапіраюцца на разумовае бачанне»). Мастацкая мова кожнага віду мастацтва дыктуе змест арганізацыі навучання канкрэтнай спецыяльнасці.

Л.Е. Раманенка, працягваючы свае даследаванні феномена мастацкай адукацыі, у артыкуле «Аб культуры, Мастаку і прафесійнай мастацкай адукацыі...» падкрэсліла, што **асноўная культуралагічная значнасць прафесійнай мастацкай адукацыі** (як складаючага кампанента сістэмы мастацкай адукацыі Рэспублікі Беларусь) заключаецца ў **падрыхтоўцы творцаў мастацкіх каштоўнасцяў**, задачы якіх павінны быць суаднесены з культуратворчай і культурапераўтворнай місіяй Мастака ў сацыякультурнай прасторы [9, с. 5].

У якасці часткі агульнай сістэмы адукацыі краіны адукацыя ў галіне культуры ажыццяўляе фарміраванне эстэтычнага погляду на свет, садзейнічае гуманізацыі навучання. У агульнаадукацыйнай школе прадметы мастацкага цыкла з'яўляюцца арганічнай часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу, аднак займаюць даволі невялікую частку адведзенага вучэбнага часу. Крыху выпраўляе становішча наяўнасць агульнаадукацыйных школ з паглыбленым вывучэннем прадметаў эстэтычнага цыкла, а таксама існаванне разгорнутай сеткі дзіцячых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школ мастацтваў, якія даюць паглыбленыя веды па розных відах мастацтва, прафесійна арыентуюць і рыхтуюць да паступлення ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы мастацтваў.

Чатыры асноўныя кірункі — выяўленчае мастацтва, музыка, харэаграфія, тэатр — замацаваліся як ў сусветнай практыцы арганізацыі мастацкага навучання, так і ў нашай краіне. Аб'ядноўваючыся агульным — творчай дзейнасцю, накіраванай на стварэнне (увасабленне) твора мастацтва, усе яны адрозніваюцца паміж сабой сутнасцю авалодання сродкамі і прыёмамі матэрыялізацыі кожнага віду (роду, жанру) мастацтва.

**Усе гэтыя асноўныя кірункі, істотна адрозніваючыся ў мастацкай мове, аб'ядноўваюцца галоўным: асновай спасціжэння мастацтва — інтуітыўным ці непасрэдным, пачуццёва-эмацыянальным, успрыняццем.** Яркая вобразнасць, метафарычнасць аказваюць моцны ўплыў на чалавека, вызваляюць яго ўнутраныя творчыя рэзервы, заахвочваюць хуткае засваенне прафесійных мастацкіх навыкаў. Складаныя дыдактычныя механізмы і рацыянальны аналіз — аснова прыродазнаўча-матэматычнага кірунку сістэмы адукацыі; для мастацкага ж навучання гэта дапаможны элемент. Уся сістэма навучання мастацтву пабудавана на развіцці творчых задаткаў, на заахвочванні творчай дзейнасці праз непасрэднае творчае мастацкае стваральніцтва.

Прафесійная (спецыяльная) мастацкая адукацыя базіруецца на прынцыпах агульнай мастацкай адукацыі з паглыбленнем і пашырэннем прафесійнага, спецыяльнага трэнажу (рухальных навыкаў і ўменняў) і творчага развіцця асобы: фантазіі, інтэлекту, мастацкіх эмоцый і густу. Для яе характэрны ранні адбор на падставе ўсебаковага вывучэння і выяўлення прыродных здольнасцей, як агульнамастацкіх, так і спецыяльных прафесійных. Часта адбор расцягваецца ў часе і ажыццяўляецца праз падрыхтоўчыя групы, куды прыводзяць дзяцей для мастацкага развіцця. Навучанне з прафесійнай арыентацыяй пачынаецца ў музыцы ўжо з сямі-васьмі гадоў, харэаграфіі — з дзесяці, выяўленчым мастацтве — з дванаццаці. Гэта тлумачыцца не толькі лягчэйшым засваеннем навыкаў і ведаў у раннім узросце, але і магчымасцю больш паспяховай псіхафізіялагічнай прыстасаванасці да пэўных спецыяльнасцей.

**Асновай навучання** ва ўстановах прафесійнай мастацкай адукацыі **з'яўляюцца індывідуальныя формы працы**, бо навучанне мастацтву вызначаецца спецыфікай — непасрэднай перадачай настаўнікам сакрэтаў творчасці вучню — «ад сэрца да сэрца». **Гэтая сутнасць вызначана эзатэрычнасцю мастацкай мовы, немагчымасцю замены творчага працэсу панятыйнымі ведамі, прыблізнасцю слоўных асацыяцый.** Найважнейшай формай мастацкага вучэбна-выхаваўчага працэсу з'яўляецца ўрок у класе па спецыяльнасці — практычная дзейнасць вучня, студэнта пад кіраўніцтвам настаўніка, прафесара. Гэтая жывая практыка — увасабленне твора мастацтва, адпрацоўка яго асобных элементаў. Яна падмацоўваецца самастойнымі заняткамі, якія па сутнасці служаць такой жа практыкай па засваенні твора мастацтва, па ўдасканаленні ўменняў, навыкаў, паглыбленні ведаў. Такім чынам, спецыяльны клас — асноватворны від практыкі ва ўсёй сістэме мастацкай адукацыі. Ён падмацоўваецца канцэртнай (для музыкантаў), сцэнічнай (для тэатралаў), пленэрнай ці выставачнай (для мастакоў) і іншымі формамі практыкі, скіраванымі на кантакт з публікай. Спецыяльны клас — гэта прафесійная «школа», якая мае даўнія гістарычныя вытокі і вядома як школа-майстэрня.

Адносіны настаўніка і вучняў — «клетка», з якой развіваецца «арганізм» культурнай традыцыі. Школа-майстэрня ўпарадкавае гэтыя адносіны, стварае ўмовы, якія дазваляюць зрабіць выдатныя дасягненні майстра рэальнымі для многіх паслядоўнікаў, а дасягненні школы — здабыткамі прафесійнай традыцыі ў цэлым. Такія ўмовы характарызуюцца сплавам прафесійнага навучання з сумеснай жыццядзейнасцю. Гэтаму спрыяла іерархічная сістэма адносін паміж майстрам, чаляднікамі і малодшымі вучнямі, вытокі якой — у сямейна-радавых асновах арганізацыі сярэдневяковых прафесійных аб'яднанняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[12, с. 28]. Сутнасць мастацтва і асаблівасці яго спасціжэння вымагалі сумеснай дзейнасці майстра-настаўніка і яго вучняў. Настаўнік уводзіў вучня ў творчасць, яны разам шукалі «тайну» мастацтва. Гэта праяўлялася ў сумеснай мастацкай практыцы: часта чаляднікі падрыхтоўвалі аснову карціны ці скульптуры, а майстар у заключэнне наносіў вызначальныя штрыхі. Настаўнік-харэограф, як і настаўнік-рэжысёр, праз сваіх вучняў і разам з імі адбудоўваў пластычны спектакль. Да нашага часу захавалася і традыцыя музычнай школы-майстэрні, якая існуе зараз у адасобленых звёнах навучання — дзіцячай музычнай школе, музычным вучылішчы, музычнай ВНУ.

У Рэспубліцы Беларусь склаўся станоўчы вопыт у падрыхтоўцы кадраў для галіны культуры, склалася ўстойлівая сістэма бесперапыннай адукацыі ў сферы мастацтва.




Сістэма бесперапыннай адукацыі ў сферы мастацтва

21 сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова культуры складае асноўную частку прафесійнага звяна бесперапыннай адукацыі ў сферы культуры. Рыхтуюцца спецыялісты па 48 спецыяльнасцях і спецыялізацыях: мастакі-афарміцелі, выкладчыкі дзіцячых музычных, мастацкіх, харэаграфічных школ, канцэртмайстры, бібліятэкары, арганізатары самадзейнай клубнай дзейнасці.

Падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі вядзецца ў трох ВНУ: Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускай акадэміі мастацтваў, Беларускім універсітэце культуры. Разгорнута падрыхтоўка навуковых і навукова-педагагічных кадраў у аспірантурах, асістэнтурах-стажыроўках, пашыраецца паглыбленая падрыхтоўка спецыялістаў у магістратурах. Усяго налічваецца 30 спецыяльнасцей. Захоўваецца навукова-творчы патэнцыял ВНУ: працуе 46 прафесараў, 15 дактароў навук, 193 дацэнты, 146 кандыдатаў навук, 16 народных артыстаў, 50 заслужаных артыстаў, дзеячаў мастацтваў і культуры, работнікаў адукацыі.

Зразумела, што асноўная роля ў набыцці прафесійнай падрыхтоўкі належыць навучальным установам, але толькі тады спецыяліст застаецца на ўзроўні патрабаванняў да прафесійнай дзейнасці, калі ён увесь час павышае сваю прафесійную кваліфікацыю, свой агульнакультурны ўзровень. Не будзе перабольшваннем зазначыць, што будучыня культуры ў многім залежыць ад арганізацыі паслядыпломнай адукацыі, ад функцыянавання ў цэлым сістэмы бесперапыннай адукацыі. **Цэнтр цяжару ва ўдасканаленні спецыяліста, яго няспыннага росту перамясціўся, безумоўна, ва ўстановы паслядыпломнай адукацыі.**

Кароткатэрміновае навучанне з'яўляецца асновай дзейнасці абласных курсаў у Гомелі, Брэсце, Гродне, Магілёве. У Віцебску яно вядзецца на базе абласнога навукова-метадычнага цэнтра і абласной бібліятэкі. Асноўныя катэгорыі спецыялістаў павышаюць сваю кваліфікацыю ў Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры, на факультэце павышэння кваліфікацыі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, факультэце павышэння



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры.

Для сістэмы бесперапыннай адукацыі ў галіне культуры характэрна ўзаемаабумоўленасць, пераемнасць як важны сродак дасягнення паступальнасці ў развіцці асобы. Аднак, калі пераемнасць па вертыкалі (паслядоўна нарастаючая складанасць вучэбнай дзейнасці) адпрацаваная і эфектыўная, то пераемнасць гарызантальная (межпрадметныя сувязі, суадносіны ў змесце адукацыі агульнатэарэтычных, спецыяльных і прыкладных дысцыплін) патрабуе значнага ўдасканалення.

Неабходны таксама структурныя змены: цікавы прыклад падае існаванне Рэспубліканскага вучэбнага комплексу гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Установа — унікальны комплекс па раннім выяўленні і прыцягненні на вучобу найбольш адораных дзяцей, укараненні раннеўзроставай сістэмы музычнага развіцця і прафесійнага навучання з элементамі вышэйшага выканальніцкага майстэрства. У аснове навучання дзяцей — усямернае развіццё прыродных задаткаў, стымуляванне творчай фантазіі і далучэнне ўжо з першых крокаў да канцэртных выступленняў. Комплекс складаюць тры блокі, тры ўзыходзячыя ступені: ранні, ці дзіцячы (6—10 гадоў), — узровень прафесійнай арыентацыі; падлеткавы (11—15 гадоў) — узровень набыцця асноў прафесіі; юнацкі (16—18 гадоў) — асноўная прафесійная ступень, на якой непасрэдная творчая дзейнасць становіцца сэнсам жыцця, актыўна ідзе засваенне вышэйшага выканальніцкага майстэрства. Звычайная практыка — выпускны экзамен па спецыяльнасці на сцэне філармоніі з праграмай, якая можа скласці гонар і выпускніку Акадэміі музыкі.

Трэба пайсці далей — аб'яднацца ў адзінае цэлае з ВНУ — Акадэміяй музыкі з яе звеннямі паслядыпломнай адукацыі. Наваўтвораны вучэбны комплекс будзе мець у сваім складзе ўсе ўзроўні бесперапыннай адукацыі: ад пачатковага да вышэйшага і паслядыпломнага. Такое аб'яднанне дазволіць удасканаліць гарызантальную пераемнасць: пашырыць міжпрадметныя сувязі, удакладніць суадносіны агульнатэарэтычных, спецыяльных і прыкладных дысцыплін, пазбавіць ад паўтораў і дубліравання ў вучэбным матэрыяле, у цэлым абагаціць змест адукацыі. Тым самым будуць створаны перадумовы для структурнага афармлення бесперапыннай адукацыі ў сферы музыкі і далейшага разгортвання па ўсіх відах мастацтва.

Падсумоўваючы вышэйвыкладзенае, прапануем шматузроўневую паслядоўнасць бесперапыннай мастацкай адукацыі ў табліцы. Яна адпавядае адукацыі ва ўсіх відах мастацтва (адрозненне праяўляецца толькі ва ўзроставых межах навучэнцаў) і разгортваецца па ўзроўнях ускладнення адукацыйнай і творчай дзейнасці. У чацвёртым стаўбцы дадзены асноўныя этапы сацыялізацыі асобы па класіфікацыі Я.М. Бабосава [1, с. 204—208], з якімі суадносяцца ўзроўні бесперапыннай адукацыі. Бесперапынная мастацкая адукацыя з'яўляецца важным інстытутам, які забяспечвае сацыялізацыю асобы.

Відавочна, што сістэма бесперапыннай мастацкай адукацыі мае мэтанакіраванасць і паслядоўнасць у структурным разгортванні. Галоўная задача зараз — удасканальваць яе ўзаемасувязі і ступені з мэтай максімальнага набліжэння да прынцыпу пераемнасці, у тым ліку «стыкаваць» вучэбныя планы і праграмы, пераарыентоўваць вучэбна-выхаваўчы працэс з імкнення да уніфікаванага выніку на дзяржаўным экзамене, — усё скіравана на развіццё *асобы* музыканта ці мастака [3, с. 15].

1. *Бабосов Е.М.* Социология. Ч. 1: Общая социологическая теория. — Мн.: Дизайн ПРО, 1998.

2. *Даринский А.* Непрерывное образование // Сов. педагогика. — 1975. — № 1.

3. *Зинченко Г.* Предпосылки становления теории непрерывного образование // Сов. педагогика. — 1991. — № 1. — С. 81—87.

4. Канцэпцыя прафесійнай адукацыі ў галіне мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь / Рэд.-склад. В. Яканюк. — Мн.: БДА музыкі, 1999.

5. Новейший философский словарь / Сост. А.А. Грицанов. — Мн., 1999.

6. ОКРБ 011-2001. Общегосударственный классификатор Республики Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Узровень бесперапыннай адукацыі | Змест навучання | Навучальная ўстанова | Этап сацыялізацыі |
|---|---|---|---|
| 1. Першапачатковы | Першыя крокі ў мастацтве, падтрымка робкіх парасткаў мастацкіх здольнасцей і іх развіццё | Дашкольныя ўстановы і падрыхтоўчыя групы дзіцячых школ мастацтваў | II і III, дзяцінства (4—6 гадоў) |
| 2. Пачатковы | Фарміраванне пачатковых навыкаў і ўменняў у мастацтве, праяўленне творчых здольнасцей і схільнасцей, першыя вопыты самавыяўлення. У масавай сістэме навучання яшчэ не адбываецца яўнага размежавання на будучых прафесіяналаў і аматараў, але ўжо намячаецца іх творчы патэнцыял | Пачатковыя класы агульнаадукацыйных школ і дзіцячых школ мастацтваў | IV, малодшыя школьнікі (6—11 гадоў) |
| 3. Арыентацыйны | Прафесійнае выяўленне і замацаванне ў абраным кірунку мастацкай творчасці, прафесійна арыентаванае навучанне і спецыялізацыя з разлікам паступлення ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы | Сярэднія класы агульнаадукацыйных школ і старэйшыя класы дзіцячых школ мастацтваў | V, падлеткі (12—14 гадоў) |
| 4. Прафесійны сярэдні | Прафесійнае самавызначэнне, практычнае засваенне прафесійных навыкаў і ўменняў, тэарэтычных прынцыпаў, формаў і метадаў у абранай спецыяльнасці, набыццё кваліфікацыі | Сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы | VI, юнацтва (14—18 гадоў) |
| 5. Прафесійны вышэйшы | Вывучэнне, стварэнне і прапаганда мастацкіх каштоўнасцяў, паглыбленне спецыяльных ведаў, выхаванне прафесіянала ў мастацтве з імкненнем да няспыннага ўдасканалення | Вышэйшыя навучальныя ўстановы | VII, позняе юнацтва (18—25 гадоў) |
| 6. Майстэрства | Удасканаленне прафесіяналізму, спецыялізацыя на абраным накірунку сацыякультурнай дзейнасці, навуковыя распрацоўкі | Магістратура, аспірантура, асістэнтура-стажыроўка ВНУ | VIII, чалавечая сталасць (25—60 гадоў) |
| 7. Самасцвярджэнне | Самаадукацыя і самаўдасканаленне на працягу практычнай дзейнасці, паглыбленне тэарэтычных ведаў, магчымае засваенне новых відаў ці жанраў мастацтва; павышэнне кваліфікацыі (пастаяннае, перыядычнае), перападрыхтоўка | Факультэты павышэння кваліфікацыі ВНУ, паслядыпломныя ўстановы адукацыіі. Самаадукацыя | |

Специальности и квалификации. — Мн.: Госстандарт, 2002. — 258 с.

7. *Осипов В.Г.* Социально-философский анализ современной концепции непрерывного образования. — Ереван, 1989.

8. *Пракапцова В.* Мастацкая адукацыя ў Беларусі. — Мн.: БДУ культуры, 1999.

9. *Романенко Л.Е.* О культуре, Художнике и профессиональном художественном образовании... // Маст. адукацыя і культура. — 2003. — № 2. — С. 3—5.

10. *Романенко Л.Е.* Художественное образование как феномен культуры: постановка проблемы // Маст. адукацыя і культура. — 2002. — № 2. — С. 16—19.

11. *Сорокин П.* Человек. Цивилизация. Общество. — М.: Политиздат, 1992.

12. *Фомин В.* Школа-мастерская как феномен культуры: (К проблеме специфики профессионального музыкального образования) // Муз. образование — личность — культура. — М., 1989. — С. 26—42.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ